**Паўлава А. Я.**

# МАТЭРЫЯЛЫ АРХІВА ПІСЬМЕННІКА У. С. КАРАТКЕВІЧА ЯК ГІСТАРЫЧНЫЯ КРЫНІЦЫ: ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ ЗБОРУ Ў ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ

Крыніцы асабістага паходжання ўяўляюць спецыфічную групу носьбітаў звестак аб мінулым. Каштоўнасць і ўнікальнасць асабістых фондаў заключаецца ў разнастайнасці матэрыялаў, якія ўваходзяць у іх склад. Гэтыя зборы з'яўляюцца ўнікальнымі комплекснымі крыніцамі. З аднаго боку, яны даюць уяўленне пра жыццёвы і творчы шлях дзеячоў культуры і навукі, прадстаўляюць ўнікальную магчымасць зазірнуць у творчую майстэрню пісьменніка, прасачыць стадыі стварэння твораў ад першапачатковай задумкі да канчатковага варыянта. З другога – матэрыялы архіўных збораў пісьменнікаў з'яўляюцца крыніцамі, якія адлюстроўваюць час як праз меркаванні аб з'явах і падзеях непасрэдна фондаўтваральнікаў, але і праз тыя сюжэты і вобразы, што літаратары выбіраюць для сваіх твораў.

Сярод калекцый рукапіснага фонда Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБНАН Беларусі) знаходзіцца і асабісты фонд выбітнага беларускага літаратара Уладзіміра Караткевіча, аднаго з найбольш яскравых фігур у беларускай літаратуры другой паловы XX ст. Негледзячы на прынцып недрабімасці архіўнай спадчыны, архіў выбітнага пісьменніка захоўваецца ў двух установах – БДАМЛМ (377 адзінак захавання) і (ЦНБ НАН, дзе знаходзіцца асноўны архіў, больш за 1600 адзінак захавання). У свой час сам пісьменнік так размеркаваў архіў паміж прыгаданымі ўстановамі. Яшчэ пры жыцці ён перадаў на захаванне ў ЦНБ НАНБ вялікую частку сваіх рукапісаў: аўтографы і машынапіс вершаў, першага паэтычнага зборніка "Матчына душа", карэктуры зборнікаў паэзіі "Вячэрнія ветразі" і "Мая Іліяда", машынапіс і карэктура раманаў "Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Нельга забыць", "Чорны замак Альшанскі", іншых літаратурных твораў, а таксама аўтабіяграфій, нарысаў, артыкулаў і аўтограф лібрэта оперы "Сівая легенда". Сярод атрыманых матэрыялаў былі і малюнкі аўтарства пісьменніка, накіды партрэтаў У. Караткевіча, зробленыя рознымі асобамі.

Ужо пасля смерці пісьменніка яго архіўны збор папоўнілі асабістым ліставаннем даследчык жыцця і творчай дзейнасці У. Караткевіча А. Верабей, прафесар Кракаўскага ўніверсітэта З. Нядзеля. Ад сястры пісьменніка Н. С. Кучкоўскай ЦНБ НАН Беларусі атрымала астатнюю частку архіва [3].

Вывучэнне матэрыялаў архіўнага збору дазволіла заўважыць некаторыя асаблівасціпрацэсса творчасці. Так, ствараючы чарнавыя накіды вершаў, У. Караткевіч пакідаў паміж радкамі дастаткова месца, каб было магчыма ўнесці змены, у выпадку новай ідэі [4]. Увогуле, для запісу чарнавых накідаў і сваіх ідэй пісьменнік выкарытоўваў любыя паперкі, на якіх можна зафіксаваць свае думкі, радкі ці малюнкі. Пад адной вокладкай можна знайсці накіды твораў, малюнкі (сярод якіх партрэты А. С. Пушкіна, М. В. Гогаля і К. Каліноўскага), дэталёвыя тлумачэнні пра тыпы нямецкіх самалетаў перыяда Другой сусветнай вайны, спісы дзеючых асоб, назвы тракціраў і корчмаў (магчыма, для выкарыстння падчас напісання твораў) [21; 31].

Нельга не адзначыць наяўнасць у архіве вялікай колькасці запісных кніжак і блакнотаў з накідамі вершаў і апавяданняў, рабочымі дзённікавымі запісамі, заўвагамі пісьменніка. Значная колькасць гэтых кніжак былі зроблены са школьных сшыткаў. Аб важнасці гэтыхштодзённікаўсведчаць запісы на выпадак страты на унутраніх вокладках: " Хто знойдзе гэтую кніжку, хай дашле яе па адрасу… (за ўзнагароду)" [10]. Запісы ў гэтых кніжках таксама раскрываюць асаблівасці літаратурнай творчасці У. Караткевіча. Так, у адной з іх запісана : " …разработать те планы, что лежат. Распределить их на 3 месяца. Сделать для этого тетради…" [9, арк. 91]. У другой кніжцы можна знайсці пералікі твораў, прызначаных для публікацыі ў часопісах "Полымя" і "Маладосць", а таксама пэўныя заўвагі аб працы над творамі : " развитие образов, детали, язык, афористичность, остромие, блоки Эренбурга…". У той жа час з гэтых кніжак можна даведацца аб настаўніцкай дзейнасці У. Караткевіча, планах і схеме падрыхтоўкі да здачы кандыдацкіх мінімумаў [7].

Трэба адзначыць, што матэрыялы збору У. Караткевіча дазваляюць даведацца пра самыя розныя бакі паўсядзеннага жыцця пісьменніка. Цікавасць даследчыкаў жыцця і творчасці выбітнага літаратара можа выклікаць сабраная ім падборка перакладзеных на беларускую мову гістарычных анекдотаў, жартаў и афарызмаў "аб дасціпных адказах і тонкіх учынках усіх часоў і народаў на навучэнне ўсім беларускім чытачым часопісаў" для публікацыі ў часопісах "Маладосць" і "Беларусь" у 1973 г. [8]. Сярод крыніц аб адваротнай сувязі У. Караткевіча са сваімі чытачамівыдзяляюцца матэрыялы аб сустрэчах-канферэнцыях пісьменніка са сваімі чытачамі, перапіска з саветам літаратурна-краязнаўчага музея Гудзевіцкай сярэдняй школы, з вучнямі Слонімскай сярэдняй і Жураўскай васьмігадовай школ [32; 33; 37; 38; 39]. Пісьменнік актыўна супрацоўнічаў з музеямі краіны, аб чым сведчыць перапіска з літаратурнымі музеямі П. Броўкі, М. Багдановіча і Д. Сімановіча [34; 35; 36].

Для студэнтаў-філолагаў і літаратуразнаўцаў выклікаюць цікавасць матэрыялы заперыяд навучання У. С. Караткевіча ў Кіеўскім універсітэце і аспірантуры. Збор ў аддзеле рэдкіх рукапісаў і кніг ЦНБ НАН утрымлівае канспекты пісьменніка па антычнай літаратуры, стараславянскай мове, гісторыі рускай літаратуры і гісторыі філасофіі [22; 23; 24; 28]. Захаваліся тэкст дыпломнай работы па тэме "Казка. Легенда. Паданне" і матэрыялы па яе падрыхтоўцы [26; 27]. У папцы, на якой рукой пісьменніка пазначана "Архіў. (Яшчэ ўніверсітэцкі)", можна пазнаёміцца з тэкстам выступу будучага пісьменніка на студэнцкім сходзе і жартоўнымі вершамі-прысвячэннямі, убачыць замалёўкі да насценнай універсітэцкай газеты [25].

У. С. Караткевіч актыўна ўдзельнічаў і ў помнікаахоўнай дзейнасці. У складзе фонда адклаліся ягоныя выступы і афіцыйныя дакументы Рэспубліканскай рады грамадскага аб'яднання "Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры" [16; 17; 18; 19; 20].

Мы ўсе ведаем У. С. Караткевіча, як заснавальніка гістарычнага і гісторыка-прыгодніцкага жанру ў беларускай літаратуры. Пісьменнік на высокім мастацкім узроўні распавёў пра многія значныя падзеі айчыннай гісторыі, перадаў дух мінулых эпох, стварыў непаўторныя характары, раскрыў багаты духоўны мір сваіх герояў і звязаў іх асабісты лёс з лёсам народа і краіны [2]. Доктар філасофіі з Карлава ўніверсітэта (Прага, Чэхия), заснавальнік чэшскай беларусістыкі, Вацлаў Жыдліцкі, вызначаегэтую грань пісьменніцкага таленту У. Караткевіча, як яго гісторыясофскі падыход да творчасці "больш, чым уласна гісторыяй, займаецца яе сэнсам. Матэрыял чэрпае з легендаў, старых хронік, народных паданняў" [40, арк. 12–13]. З гэтай нагоды мае сэнс азнаёміцца з захаваўшыміся ў архіўным зборы ўніверсітэцкімі канспектамі па філасофіі і разважаннямі літаратара над філасофскімі праблемамі.

Вывучэнне матэрыялаў фонду У. Караткевіча паказала, што самую вялікую цікавасць пісьменніка выклікалі падзеі другой паловы XIX стагоддзя, перыяд паўстання 1863–1864 г. і дзейнасць К. Каліноўскага. Запісы пра падзеі і разважанні пра азначаны перыяд, а таксама малюнкі юнакоў, нагадваючых К. Каліноўскага, можна знайсці ў вялікаў колькасці дакументаў архіўнага фонда.

Неабходна адзначыць, што пісьменнік вельмі адказна падыходзіў да напісання твораў. Таму зараз хочацца спыніцца на характарыстыцы некаторых матэрыялаў архіўнага збора пісьменніка, якія раскрываюць спецыфіку яго працы над творамі, прысвечанымі розным перыядам беларускай гісторыі.

Так, ва ўступе "Замест праспекту" да знакамітага публіцыстычнга нарыса "Зямля пад белымі крыламі" (Мая Беларусь), напісанага першапачаткова для ўкраінскай моладзі, Уладзімір Сямёнавіч пазначыў: "Чалавека нельга ўявіць па за гісторыяй. Раздзел, прысвечаны ёй пачнецца з археалагічнай часткі, з пляменаў Паморскай, Зарубінецкай і іншых культур, з балотных і рачных гарадзішчаў, з раскопак, якія выяўляюць дзівосныя рэчы, з берасцяных грамат і знаходак старажытных ідалаў" [5, арк. 4.]. У якасці крыніц да гэтай часткі свайго нарыса У. С. Караткевіч адзначыў, што "…калі справа ідзе пра гісторыю, карыстаўся сумленнымі, вартымі даверу, кніжкамі" [6, арк. 3.].

У інтэрв'ю пад назвай "Любую справу рабіць хвацка" пісьменнік так апісваў пачатак працы над тым ці іншым творам: "Калі я ведаю аб чым пісаць, я ведаю і як пісаць. Таму ў мяне практычна няма чарнавікоў. Ёсць толькі накіды сюжэта… Там усё: героі, абстаноўка, планы месца дзеяння, жыллё дзейных асоб…, падрабязныя біяграфіі герояў, манеры герояў, іхнія ўчынкі і іншыя дэталі. Абдумаю як след – сядаю за стол" [1, арк. 2–3]. Як сведкі гэтай працы ў БДАМЛМ і ў фондзе аддзела рэдкіх кнг і рукапісаў ЦНБ НАН зберагаюцца чарнавыя накіды і задумкі сюжэтаў [14, арк. 2–15; 30, арк. 55–67].

Захаваліся ў архіўным зборы і чарнавікі, фрагменты і накіды шэрагу не завершаных твораў, напрыклад, гістарычных раманаў "Фенікс" і "Аршанская рошчына", аповесці "Шантаж" [11; 12; 13]. Сярод падрыхтаваных матэрылаў да аповесці "Шантаж", працу над якой пісьменнік пачаў у 1978 г., акрамя традыцыйных пераліку і характарыстыкі герояў, захаваліся падрабязныя запісы У. Караткевіча пра сістэму нямецкай акупацыйнай ўлады, нацысцкую сімволіку, апісанне знешнасці В. Кубе, выпіскі з артыкулаў калабарацыянісцкай газеты "Новы шлях", заўвагі аб падзеях 1941–1942 гг.

Цікавасць уяўляюць і матэрыялы, сабраны пісьменнікам падчас працы над публіцыстычным нарысам "Мсціслаў". Па-першае, трэба адзначыць схему размяшчэння гэтых падрыхтоўчых запісаў на лістах. Пісьменнік дзяліў кожны ліст на дзве часткі. У левай частцы запісваўся асноўны тэкст, а справа – рабіліся дадатковыя заўвагі. У. Караткевіч склаў для сябе падрабязны храналагічны агляд падзей. Дэталёва распісаў падзеі у краі на працягу 1917–1918 гг. З падзей міжваеннага перыяду літаратар пазначыў толькі пабудову ЦЭС у 1924 г., ГЭС на Віхры – у 1926 г., а таксама заводы і арцелі, пабудаваныя ў гады першай пяцігодкі. У той жа час значная ўвага была нададзена аўтарам нарыса апісанню помнікаў гісторыі і архітэктуры, вывучэнню іменаў выбітных ураджэнцаў Мсціслаўшчыны і складанню спіса фотаілюстрацый [29, арк. 1–41]. Аналагічным чынам пісьменнік рыхтаваўся да напісання рамана "Аршанская рошчына" [12, арк. 1–15].

Зразумела, што як бы ні стараўся літаратар, спецыялісты-гісторыкі заўсёды змогуць знайсці пэўныя гістарычныя неадпаведнасці ў творах мастацкай літаратуры. З гэтай находы цікава

звярнуцца да разважання прызнанага майстра пяра, як прафесійным гісторыкам трэба ставіцца да літаратуры. У фондзе пісьменніка ў ЦНБ НАН захаваліся “Некаторыя тлумачэнні наконт рэцэнзіі В. І. Мялешкі на п’есу У. Караткевіча “Званы Віцебска”. У сваім адказе В. І. Мялешку пісьменнік, можна сказаць, дае тлумачэнні усім гісторыкам ад усіх літаратараў пра мастацтва разумення задумак аўтараў. У. С. Караткевіч з павагай пазначае, што “ён падышоў да майго твора як дакладны, скурпулёзны, дабрасумленны гісторык. Так падыходзіць да мастацкага твора нельга. Таму што мастак падыходзіць да гісторыі як мастак, не як гісторык. І таму гісторыкам, не разумеючым літаратуру, кніг на рэцэнзіі даваць нельга… Гісторык, калі ён добрасумленны, стварае праўдзівы дакумент (менавіта так пазначана ў тэксце У. С. Караткевіча) аб тых ці іншых падзеях. Пісьменнік піша “творимую легенду” аб гэтых падзеях.

Нашаму чытачу (гледачу) глыбока напляваць на сацыяльны, нацыянальны і рэлігійны прыгнёт. Ён, асабліва малады, проста не ўяўляе, з якой кашаю тыя штукі ядуць. Але гэта не перашкаджае яму супакутваць людзям, якія такое перажылі… Вось аб чым п’еса, а не пра забойства чалавека. Таму аўтар і мае права на выдумку. Каб гэта было больш рэзка, ясна, красамоўна. Каб эта сціскала сэрца чытача і гледача мацней… А у межах выдумкі ён не мае права на “грушы на вярбе”. Затое мае права на “залатыя яблыкі”… Ніхто не мае права падняць руку на пісьменніка за права на домысел. Праўдзівы домысел, заснаваны на сапраўдным разуменні падзей гісторыі і таму часам больш праўдзівы, чым сама праўда” [15, л. 1.].

Вывучэнне архіва У. Караткевіча дазваляе сцвярджаць, што гэтыя матэрылы ўяўляюць дастаткова цікавую крыніцу не толькі аб жыцці і творчасці выбітнага літаратара, а і высокамастацкі летапіс жыцця Беларусі, на старонках якога пісьменнік прадэманстраваў глыбокае разуменне гістарычных працэсаў, раскрыў любоў да роднай зямлі і беларусаў розных пакаленняў.


1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 22. Арк. 2–3.
2. Верабей, А. Л. Проблема историзма в прозе Владимира Короткевича / А. Л. Верабей // Роль просветителей в Беларуси и Турции : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 9 апр. 2011 г. – Минск : РИВШ, 2011. – С. 102–108.
3. Жук, Т. И. Рукописное наследие Владимира Короткевича в фондах отдела редких и книг и рукописей Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси / Т. И. Жук // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 26–27 мая 2015 г. / Междунар. ассоц. акад. наук, Совет по книгоизд. [и др.] ; редкол.: Л. А. Авгуль [и др.]. – Минск ; М., 2015. – С. 162–171.
4. Цэнтральная навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук (ЦНБ НАН) Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў (АРКіР). – Ф. 11. Воп. 1. Адз. зах. 40
5. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 1. Адз. зах. 107
6. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 1. Адз. зах. 120
7. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 1. Адз. зах. 462
8. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 1. Адз. зах. 468
9. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 1. Адз. зах. 481
10. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 1. Адз. зах. 485
11. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 137
12. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 138
13. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 164
14. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 165
15. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 219
16. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 238
17. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 239
18. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 240
19. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 241
20. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 242
21. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 430
22. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. Зах. 431
23. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. Зах. 432
24. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. Зах. 433
25. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. Зах. 434
26. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. Зах. 436
27. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. Зах. 437
28. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. Зах. 439
29. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 476
30. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 480.
31. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 486
32. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 971
33. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 972
34. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 974
35. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 978
36. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 979
37. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1018
38. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1019
39. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1020
40. ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1053